МГПУ им. И.П. Шамякина

# АБРАД *ПАСАД* У ФАЛЬКЛОРНЫМ ТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ ТРАДЫЦЫІ

***Мядзведзева Н. У.*** *(УА «МДПУ ім. І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– В. В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Даследаваннем беларускай вясельнай традыцыі займаліся такія знакамітыя фалькларысты і этнографы, як Б. Дабравольскі, М. Доўнар-Запольскі, П. Шэйн, Я. Карскі, М. Нікольскі і іншыя. У наш час прадаўжаюць вывучаць беларускую вясельную традыцыю Я. Крук, С. Талстая, В. Новак і іншыя даследчыкі.

***Пасад*** – важная частка вясельнага абраду, калі "для атрымання канчатковай згоды маладых на шлюб і дабраславення бацькамі жаніха і нявесту садзілі на дзяжу, на лаву, засланую вывернутым кажухом або жытнёвым снапом". Маладым дазвалялася садзіцца на дзяжу толькі ў тым выпадку, калі нявеста была цатлівай. Акрамя сімволікі інфармавання аб цнатлівасці і прадуцыравання шчасця, плоднасці і багацця (сядзенне на хлебнай дзяжы, на вывернутым поўсцю ўверх кажусе), абрад ***пасада*** выяўляе выразныя "лімінальныя матывы", гэта значыць, матывы пераходу ў іншую сацыяльную групу, змену сацыяльнага становішча маладых (звычай падпальваць валасы маладой) [1, с. 136].

Цікава, што абрад падпальвання валасоў называлі "*падстрыжэнне*", што, безумоўна, паказвае як на яго старажытныя карані, так і на тое, што даўней валасы на самой справе падстрыгалі як абавязковы рытуал. Так, паводле ўспамінаў інфарматара, маладую перад вянцом садзілі на дзяжу і "падстрыгалі": "*расчоскаю*" *расчэсвалі так во валосікі, а патом свечкаю падпальвалі тры разы так, у трох месцах, ікону абносілі кругом, і спявалі ўжэ песні*" [1, с. 93]. Таксама "*ставілі дзяжу, лажылі кажух і тады садзілі маладую на пасад, а тады "падстрыгалі":*

*кругом свечкаю абводзілі тры разы, зразу на лобіку валасы падпальвалі (свечкаю падсмальвалі), а тады тут каля вушэй ужэ. Пасля пасада ўжэ і вяселле начыналася*” [1, с. 95].

Такім чынам, любы традыцыйны вясельны абрад, у тым ліку і абрад ***пасад***, аб’ядноўвае значную колькасць “гетэрагенных матываў” і функцый: лімінальную функцыю (змены сацыяльнай ролі маладых), функцыю інфармавання аб цнатлівасці маладых, прадуцыравальную (забеспячэнне дабрабыту, плоднасці, шчасця маладой сям’і), праграмавання новых шлюбаў, забаўляльную, эстэтычную.

**Літаратура**

1. Нясвіжскага краю напеў векавы / “Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны”; пад агул. рэд.: В. С. Новак (гал. рэд.) [і інш.].– Нясвіж: Нясвіжская ўзбуйненая друкарня, 2012. – 271 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина